**Зыгмантовіч С.В.**, *дацэнт*
**Саітава В.І.**, *дацэнт*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ДАКУМЕНТАЛЬНЫЯ РЭСУРСЫ ПУБЛІЧНЫХ БІБЛІЯТЭК ЯК АСНОВА ЗАДАВАЛЬНЕННЯ ІНФАРМАЦЫЙНЫХ ПАТРЭБ СПАЖЫЎЦОЎ

Ва ўсім свеце сучасны перыяд у дзейнасці публічных бібліятэк (ПБ) характарызуецца як вельмі складаны, у пэўным сэнсе пераходны. Вызначэнне шляхоў развіцця бібліятэк гэтага тыпу ва ўмовах інтэнсіўнай інфарматызацыі грамадства, у новых сацыяльна-эканамічных умовах паўстае ў якасці актуальнай праблемы. Для яе вырашэння важным уяўляецца аналіз тэндэнцый у фарміраванні дакументальнай базы ПБ, новых падыходаў да бібліятэчна-інфармацыйнай работы.

Дакументальныя рэсурсы публічных бібліятэк рэспублікі сёння прадстаўлены рознымі відамі выданняў, але ж прапорцыі паміж дакументальнымі крыніцамі сведчаць аб абсалютнай пераваже кніжных выданняў - звыш 80%. Колькасць спецвідаў (выяўленчых, нотных выданняў, стандартаў, АВ) - менш 3%. Гэтыя лічбы падкрэсліваюць значнае адставанне і ўражальную розніцу ў відавым складзе фондаў ПБ нашай рэспублікі і высокаразвітых заходніх краін (у асобных краінах фонд АВ у ПБ дасягае 30 %). Акрамя таго, выкарыстанне ў большасці ПБ фондаў грампласцінак, магнітных стужак, дыяпазітываў немагчыма па тэхнічных умовах. Адсутнасць іншых сродкаў сучаснай інфармацыйнай АВ тэхналогіі вядзе да таго, што ПБ страчваюць магчымасць захоўваць і паказваць карыстальнікам арыгінальнасць кожнай культуры праз павышэнне яе ідэнтычнасці.

Кніжныя і іншыя дакументальныя рэсурсы ПБ імкліва старэюць, рэзка і значна паменшылася колькасць новых паступленняў, большасць ЦБС рэспублікі амаль перасталі атрымліваць расійскую перыёдыку. Камплектаванне бібліятэк рэспубліканскімі перыядычнымі выданнямі таксама нельга лічыць здавальняючым. Можна назваць адзінкавыя цэнтральныя гарадскія бібліятэкі, якія знаходзяцца ў параўнальна нядрэнным стане па камплектаванні перыядычнымі выданнямі: яны набываюць каля 18 % перыёдыкі ад агульнавыдаваемай колькасці ў рэспубліцы, у той час як многія бібліятэкі-філіялы ў раёнах атрымліваюць усяго па 3-4 беларускія газеты.

Пры агульнай тэндэнцыі росту выпуску даведачных выданняў у ПБ трапляе толькі кожнае трэцяе. Шматлікія тэматычныя прабелы, адсутнасць папулярнага аўтарскага складу, незалежных перыядычных выданняў, востры дэфіцыт вельмі патрэбнай для абслугоўвання прававаой, эканамічнай, паліталагічнай, гістарычнай, прыродазнаўчай, навукова-папулярнай, тэхнічнай літаратуры - усё гэта характарызуе негатыўныя тэндэнцыі сучаснага стану дакументальнай базы ПБ. Як вынік, расце колькасць чытачоў, незадаволеных сваёй бібліятэкай.

Праведзены аналіз тэндэнцый у развіцці патрэбнасцей як традыцыйных, так і новых катэгорый карыстальнікаў сведчыць аб неабходнасці ўзмацнення інфармацыйнай функцыі ПБ.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

На наш погляд, актуальным на сённяшні дзень з'яўляецца правядзенне рэспубліканскага комплекснага даследавання, прадметам якога павінны стаць ПБ: неабходна прааналізаваць сучасны стан гэтых бібліятэк у кантэксце новых сацыяльна-эканамічных і інфармацыйных умоў, замежнага бібліятэчнага вопыту; ацаніць рэсурснае забеспячэнне бібліятэк і на падставе выяўленых тэндэнцый навукова абгрунтаваць перспектывы іх развіцця, задачы ў сучасных умовах, прапанаваць мадэлі развіцця ПБ з улікам назапашанага ў бібліятэчнай практыцы вопыту.

Метадычным цэнтрам рэспублікі неабходна больш увагі ўдзяляць дзейнасці ПБ.

У мэтах папаўнення, пашырэння дакументальнай базы бібліятэк патрэбна больш актыўна шукаць новыя крыніцы камплектавання: наладжваць цесныя сувязі з камерцыйнымі выдавецтвамі, арганізацыямі. Плённым вынікам супрацоўніцтва паміж рэкламна-інфармацыйным прадпрыемствам «Нестар» і Мінскай ЦГБ з'явілася арганізацыя ў чытальнай зале бізнес-цэнтра. Неабходна наладжванне больш цесных узаемаадносін з органамі мясцовай улады і назапашванне фондаў афіцыйных дакументаў. Сувязі з палітычнымі партыямі і грамадскімі арганізацыямі дапамогуць ПБ набыць дакументы гэтых органаў.

Дакументальныя рэсурсы ПБ аказваюць прамое ўздзеянне на бібліятэчныя прадукты і паслугі. Неабходны новыя падыходы да інфармацыйнай работы: бібліятэкары павінны імкнуцца пашырыць асартымент прадуктаў і паслуг, навучыцца пераўтвараць «сыравіну» (назапашаныя ў бібліятэках дакументальныя, інфармацыйныя рэсурсы) у прадукты і паслугі, што дазволіць ім заняць належнае месца ў ліку суб'ектаў інфармацыйнай палітыкі.

Актуальнай задачай з'яўляецца арганізацыя доступу наведвальнікаў ПБ да рэсурсаў іншых бібліятэк праз выкарыстанне традыцыйных зводных каталогаў і навейшых камп'ютэрных тэхналогій.

Дзяржаўная падтрымка ПБ застаецца сёння асноўнай. Трэба ўзмацніць прапаганду ПБ як інфармацыйных, культурных, адукацыйных цэнтраў, рабіць усё для прызнання іх дакумен-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тальна-рэсурснай базы як асновы бібліятэчнага і інфармацыйнага абслугоўвання насельніцтва і дабівацца адпаведных арганізацыйных рашэнняў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ